Рукатворныя цуды

# Старажытны аксесуар зноў у модзе?

## Майстрыха са Смаргоні пляце ажурныя парасоны ад спякоты

**І гэта сапраўдныя творы мастацтва. Развіваецца гэта рамяство на базе Смаргонскага дома рамёстваў, а канкрэтна — у яго філіяле ў Залессі. Аграгарадок знакаміты сваім палацава-паркавым ансамблем, дзе жыў у XIX стагоддзі вядомы палітычны дзеяч і кампазітар Міхал Клеафас Агінскі. Цяпер у сядзібе створаны музей і шмат цікавых лакацый. Напрыклад, у летні сезон па дарожках парку шпацыруюць кабеты ў старадаўніх уборах і з летнімі парасонамі. Вось гэтыя самыя парасоны і пляце супрацоўніца Залескага дома рамёстваў Ніна КЕНЬКО.**



Трэба сказаць, што гэта вельмі рэдкі кірунак творчасці. На Гродзеншчыне, напрыклад, такіх майстроў больш няма. Мабыць, з-за незвычайнай спецыфікі гэтай справы, да таго ж і попыт на іх яшчэ не вельмі шырокі. І ўсё ж да падобных аксесуараў паступова з'яўляецца цікавасць.

Як расказала сама майстрыха, галоўным штуршком да гэтай справы паслужыла суседства з вядомай сядзібай Агінскага. Пасля маштабнага рамонту, які працягваўся некалькі гадоў, сядзібны комплекс поўнасцю аднавіўся. Тут сталі праходзіць балі, фестывалі, імпрэзы, якія адпавядалі мінулай эпосе. У Доме рамёстваў прапанавалі дапоўніць старадаўнія касцюмы прыгожымі парасонамі, якія таксама сугучныя таму перыяду і ладу жыцця. Такім чынам, спецыяльна для музея было выраблена восем рознакаляровых аксесуараў — у тон шляхецкаму адзенню.

Яшчэ каля дзясятка парасонаў раз'ехаліся па свеце. Адзін набыў сталічны фотасалон, два прыдбалі сёстры з Ізраіля, якія гасцілі ў Залессі, яшчэ адзін стаў падарункам ад бабулі на вяселле ўнучцы, што жыве ў ЗША, яшчэ адзін парасон паехаў у далёкі расійскі Хабараўск. Маюць такі парасон і беларускія модніцы. Дарэчы, і самі работнікі Дома рамёстваў бяруць іх падчас летніх паездак на фестывалі і кірмашы. Прыгожы парасон абавязкова прыцягвае ўвагу да павільёна, у якім яшчэ могуць прапанаваць і іншыя вырабы залескіх майстроў — саломку, вышыўку, кераміку, вязаныя цацкі. Па словах Ніны, яна такіх парасонаў яшчэ ніколі на кірмашах не бачыла.







— Як вы заўважылі, амаль кожны парасон мае свой адметны ўзор. Мне, напрыклад, вельмі падабаецца ўзор з кветкай у цэнтры, пялёсткі якой вязаныя ажурнай клеткай. Такіх парасонаў у маёй калекцыі некалькі. Таксама падабаюцца геаметрычныя ўзоры, яны глядзяцца вельмі гарманічна. Калі вызначаць самы папулярны колер, то большасць аддае перавагу беламу, я яго таксама люблю, белы парасон стварае асаблівую лёгкасць, пяшчоту, — заўважае суразмоўніца.

У справе «хэнд мэйд», ці папросту ручнога майстэрства, складана абысці бокам пытанне: як жа пачалося такое захапленне? Аказалася, ніткавая творчасць бярэ свой пачатак з дзяцінства. Як некаторыя творчыя асобы спяваюць ці малююць, колькі сябе памятаюць, так і Ніна пачала рукадзельнічаць з пачатковай школы. Спачатку маці навучыла вязаць на прутках, потым сястра прызвычаіла да кручка. Аказалася, не дарма. Навыкі сталі не толькі хобі, але і прафесійнай справай. Дарэчы, у самім Доме рамёстваў толькі яна адна валодае такім своеасаблівым відам творчасці.

Першы парасон добра памятае, бо ён быў зроблены на старой аснове і хутка зламаўся. З тае пары ў ход ідуць толькі новыя канструкцыі. Купляецца парасон, здымаецца тканіна, а замест яе прымацоўваецца ажурны купал. Зразумела, што такія парасоны не аўтаматы і існуюць, што называецца, «у поўны рост». Але для іх выбіраюцца меншыя канструкцыі.

— Выраб аднаго парасона займае больш за тыдзень, калі толькі гэтым займацца. Затым трэба аздобіць край карункамі, якіх патрабуецца да пяці метраў. У самой аснове пераважна карыстаюся акрылавымі ніткамі слонімскай фабрыкі. Гэты матэрыял эластычны, мяккі, ён лягчэй мыецца. Таксама вязала і з баваўняных нітак, а нядаўна паспрабавала лён. Такі парасон выглядае прыгожа, але невядома, наколькі ён практычны, бо нітка цяжэйшая і можа з цягам часу зламаць металічную канструкцыю. Тым не менш такія парасоны ў трэндзе, — расказвае Ніна.

Яна лічыць, што распрацаваная лінія апрабавана і мае поспех для далейшага развіцця. Сёння Дом рамёстваў рыхтуецца да ўдзелу ў чарговым Рэспубліканскім фестывалі нацыянальных культур, які адбудзецца ў чэрвені. Мяркуецца, што разам з іншымі творамі дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва ў экспазіцыі будуць прысутнічаць і прыгожыя парасоны ад Ніны Кенько. Майстрыха збіраецца пачаць работу над імі ў сакавіку.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**
**Фота дадзена гераіняй артыкула.**

### Даведка

Гісторыя сведчыць, што ў Кітаі парасон сталі выкарыстоўваць у XI стагоддзі. Аксесуар рабілі з паперы, якая была прамочана воскам. А вось палатняныя парасоны ўпершыню з'явіліся ў Францыі ў XVII стагоддзі, яны абараняплі ад сонца і атрымалі назву «парасоль», што азначае «супраць сонца». Канструкцыя рабілася з кітовага вуса, аснову складалі шоўк, аксаміт, тафта і карункі, упрыгожвалі іх паўлінавыя пер'і, каштоўныя камяні. Гэта былі прадметы раскошы. А вось наш сённяшні парасон, які выратуе ад дажджу, прапанаваў англічанін Джон Хенвей у 1772 годзе. У якасці пакрыцця ён ужыў шчыльную тканіну і хадзіў з ім па Лондане пад дажджом. На пачатку XIX стагоддзя парасон атрымаў шырокае распаўсюджванне ў Еўропе. На працягу XX стагоддзя канструкцыя яго пастаянна ўдасканальвалася, ён станавіўся больш лёгкім і кампактным, з аўтаматычным механізмам.

Фестываль

# І зноў кліча ліпень

**XXXIII Міжнародны фестываль мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску» пройдзе ў паўночнай сталіцы з 9 да 15 ліпеня. На мінулым тыдні адкрыўся продаж квіткоў на мерапрыемствы, якія пройдуць на сцэне Летняга амфітэатра, а па Віцебску прайшоў фестывальны трамвай.**



«Славянка» даўно стала не толькі сусветным культурным брэндам, але і адным з самых доўгачаканых летніх фестываляў для беларусаў і гасцей краіны. Штогод арганізатары на старце продажу квіткоў, які пачынаецца яшчэ зімой, рыхтуюць для прыхільнікаў творчасці — першых наведвальнікаў білетных кас — падарункі і сюрпрызы. Сёлетні год, які стаў у гісторыі «Базару» трыццаць трэцім, не выключэнне.

16 лютага па горадзе на Дзвіне ўпершыню праехаў першы фестывальны трамвай з сімволікай форуму мастацтваў. Дырэкцыя «Славянскага базару» разам з Віцебскім трамвайна-тралейбусным упраўленнем вырашылі сумясціць два сімвалы горада, тым больш што ў мінулым годзе віцебскаму трамваю споўнілася 125 гадоў. «Разынкай» грамадскага транспарту стала не толькі тэматычнае афармленне, але і голас, які абвяшчае прыпынкі. «Паважаныя пасажыры! Запрашаю вас у фестывальны трамвай. З вамі Алена Спірыдовіч, і я жадаю вам добрага настрою, прыемных спадарожнікаў і шчаслівых квіткоў. Да сустрэчы на 33-м Міжнародным фестывалі мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску»! Да самага закрыцця форуму ў ліпені голас нязменнай вядучай Алены Спірыдовіч будзе запрашаць жыхароў і гасцей горада на Дзвіне ў падарожжа на колах па шостым маршруце.




Першых пасажыраў сустракалі супрацоўнікі Цэнтра культуры «Віцебск» з паветранымі шарамі, сувенірамі і музыкай. Віцябчане з задавальненнем адказвалі на пытанні, звязаныя з гісторыяй фестывалю, спявалі і нават парадзіравалі зорак эстрады. Адным словам, арганізатарам у поўнай ступені ўдалося расквецiць шэры лютаўскі дзень і нагадаць пра насычанае фестывальнае лета.

З 16 лютага стартаваў продаж квіткоў на закрытую праграму праектаў у Летнім амфітэатры. У касах ЦК «Віцебск» да 19 сакавіка пры набыцці трох квіткоў пакупнікам даецца скідка на кожны трэці квіток у памеры 33 працэнтаў ад найменшай цаны на квіток. Гэта акцыя не стане апошняй, прыхільнікаў форуму мастацтваў чакаюць 33 дні акцый.

На якія праекты пакуль можна набыць квіткі? 9 ліпеня на сцэне амфітэатра прэзентуюць творчы праект з удзелам блогераў, маладзёжных выканаўцаў і найлепшых юнацкіх калектываў «Госці з будучыні». 10 ліпеня арганізатары запрашаюць усіх ахвотных на «Рок-панараму», а ўрачыстае адкрыццё 33-га форуму адбудзецца 11 ліпеня. У пятніцу 12 ліпеня пройдзе гала-канцэрт «Саюзная дзяржава запрашае...», а ноччу з галоўнай сцэны будуць раздавацца гукі «Залатога хіта». XXXIII Міжнародны конкурс выканаўцаў эстраднай песні «Віцебск» пройдзе 13 і 14 ліпеня, 14 ліпеня прыхільнікаў гумару запрашаюць на Кубак «Славянскага базару ў Віцебску» з удзелам каманд Вышэйшай лігі КВЗ і гасцей. Урачыстае закрыццё адбудзецца ўвечары 14 ліпеня, а 15 ліпеня пройдзе гала-канцэрт «Шансон ТБ — УСЕ ЗОРКІ». Квіткі на мерапрыемствы іншых фестывальных пляцовак з'явяцца пазней.

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.**
**Фота «Витебские вести».**